Гістарыяграфія

Сяргей НОВІКАЎ

# Ваенная Беларусь у найноўшых нямецкіх даследаваннях



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч — загадчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры МДЛУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в. Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл., у 1980 г. закончыў МДПІ імя М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). Сааўтар вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, навуковых выданняў "Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941—1945" (Мн., 2005), "Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц" (Мн., 2005), "Беларусь. 1941—1945: Подвиг. Трагедия. Память". (Мн., 2010), "Вяртанне ў рабства. Прымусовая праца насельніцтва Беларусі. 1941—1945 гг." (Мн., 2010). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—9 (Мн., 2002—2010).*

Беларусь у гады Другой сусветнай вайны — тэма, якая на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў пастаянна распрацоўваецца нямецкімі даследчыкамі. У 2009 г. у выдавецтве "Ferdinand Schöningh" выйшлі адразу тры грунтоўныя манаграфіі па беларускай ваеннай гісторыі. Аўтары іх — нямецкія гісторыкі Бабета Квінкерт, Богдан Мусял і Аляксандр Бракель*. Яны працягваюць навуковыя даследаванні паўсядзённага жыцця на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, надаючы пры гэтым асаблівую ўвагу сацыяльным наступствам трохгадовай нацысцкай акупацыі для грамадзянскага насельніцтва.

У працы **"Прапаганда і тэрор у Беларусі 1941—1944. Нямецкае "ментальнае" вядзенне вайны супраць грамадзянскага насельніцтва і партызан"** Б.Квінкерт на матэрыялах беларускіх, расійскіх і германскіх архіваў даследуе наступствы нацысцкай прапаганды і маштабы расавага тэрору на акупаванай беларускай тэрыторыі. Яна аналізуе дзейнасць нацысцкіх ідэалагічных служб у дачыненні да мірнага насельніцтва і ўдзельнікаў савецкага партызанскага руху, выяўляе сутнасць нацысцкай прапаганды, паказвае функцыі, змест, сродкі і этапы правядзення яе ў захопленай Беларусі.

У першай з трох частак кнігі, якая мае назву "Перадумовы" (с. 25—70), даследчыца на аснове аналізу падзей Першай сусветнай вайны выяўляе вытокі псіхалагічнага вядзення Германіяй новай вайны. Галоўны "рэцэпт" яе быў вынайдзены ў ідэях германскага нацыянал-сацыялізму, які ў 1930-я гг. распачаў падрыхтоўку "ментальнага вядзення вайны супраць СССР" (с. 43). Канчаткова гэта канцэпцыя замацавалася ў плане "Барбароса". З яго вынікала задача моцна дэстабілізаваць савецкае грамадства шляхам правядзення масавых забойстваў. Была падрыхтавана "двухэтапная мадэль" заваявання жыццёвай прасторы на Усходзе, якая прадугледжвала ваенную кампанію і ідэалагічную работу па "псіхалагічным уздзеянні на мясцовае насельніцтва". У працы зроблена абгрунтаваная выснова, што яшчэ да пачатку аперацы "Барбароса" вядзенне прапаганды сярод савецкіх людзей лічылася асабліва важнай і складанай задачай (с. 70).

*Quinkert B. Propaganda und Terror in Weissrussland 1941—1944. Die deutsche "geistliche" Kriegsfuhrung gegen Zivilbevölkerung und Partisanen. Paderborn — München — Wien — Zürich: Ferdinand Schöningh, 2009. — 420 s.; Musial B. Sowjetische Partisanen 1941—1944: Mythos und Realität. Paderborn — München — Wien — Zürich: Ferdinand Schöningh, 2009. — 592 s.; Brakel A. Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939—1944. Das westliche Weissrussland unter sowjetischer und deutscher Besatzung. Paderborn — München — Wien — Zürich: Ferdinand Schöningh, 2009. — 426 s.




Другая частка манаграфіі называецца "Структура і сродкі прапаганды" (с. 71—139). Аўтар апісвае структуру прапагандысцкага апарату, які пасля 22 чэрвеня 1941 г. пачаў дзейнічаць на цэнтральным, рэгіянальным і лакальным узроўнях. Раскрываючы асноўныя задачы, якія вырашалі прапагандысцкі апарат вермахта, Рэйхсміністэрства па занятых усходніх тэрыторыях і яго службы ў Генеральным камісарыяце Беларусь, Рэйхсміністэрства народнай асветы і прапаганды, Міністэрства замежных спраў і яго "Спецыяльны рускі камітэт", прапагандысты паліцыі бяспекі і СД, Б.Квінкерт прыходзіць да высновы, што ў "прапагандысцкай вайне" супраць СССР удзельнічалі не толькі шматлікія нацысцкія ўстановы, але і значная колькасць "мясцовых прапагандыстаў" (с. 108). Змены ў структуры прапагандысцкага апарату сведчылі аб тым, што першапачаткова ён ствараўся без уліку рэальнага развіцця падзей на Усходзе. Выкананню прапагандысцкіх задач служыў вялікі арсенал тэхнічных сродкаў: пункты прапаганды, сродкі друку, пункты апрацоўкі і множання фатаграфій, падрыхтоўкі нагляднага матэрыялу і выстаў, радыётрансляцыя і дэманстрацыя кіно. Даследчыца паказвае, што акупацыйныя ўлады здолелі наладзіць на месцы рэгулярнае прапагандысцкае забеспячэнне толькі ў пачатку 1942 г. (с. 139). Аднак у асобных раёнах яно так і не пачало працаваць.

Трэцяя частка "Змест, функцыі і ход прапаганды" (с. 140—368) займае больш за палову ўсяго даследавання. У ёй аўтар дэталёва разглядае асноўныя этапы "прапагандысцкай вайны" супраць беларускага грамадзянскага насельніцтва і ўдзельнікаў савецкага партызанскага руху. Б.Квінкерт звяртаецца да розных дакументальных фактаў аб прапагандзе на акупаванай тэрыторыі Беларусі летам 1941 г., аналізуе рэакцыю мясцовага насельніцтва і робіць выснову аб няўдачы прапагандысцкай "канцэпцыі" нацыстаў (с. 156). Іх антысеміцкая прапаганда не знайшла падтрымкі сярод беларускага насельніцтва.

Далей аўтар выяўляе праблемы, з якімі сутыкнуўся прапагандысцкі апарат нацыстаў восенню 1942 г., і паказвае ход іх рашэння ва ўмовах новых абставін на акупаванай тэрыторыі Беларусі. У сваёй дзейнасці, звязанай з падрыхтоўкай "аграрнай рэформы", правядзеннем акцый уціхамірвання грамадзянскага насельніцтва, вядзеннем барацьбы супраць партызан, масавым вынішчэннем яўрэйскага насельніцтва, прапагандысцкі апарат зыходзіў выключна з раней прынятых дырэктыў у дачыненні да акупаваных савецкіх тэрыторый і вядзення вайны на вынішчэнне. У кнізе зроблена выснова, што ў акупаванай Беларусі прапагандысты, якія былі непасрэднымі ўдзельнікамі масавага вынішчэння мясцовага насельніцтва (у першую чаргу яўрэяў), апынуліся ў складанай сітуацыі (с. 188). У выніку ваенныя і грамадзянскія службы нацыстаў пачалі каардынаваць паміж сабой дзейнасць па вядзенню прапаганды. З пачатку 1942 г. прапагандысцкія службы павінны былі кіравацца дырэктывамі аб "новай палітычнай адбудове" захопленай тэрыторыі ў адпаведнасці з ідэямі антысемітызму, антырусізму і антыпольскасці (с. 193). Палітыка рэпрэсій у дачыненні да мясцовага насельніцтва павінна была праводзіцца па прынцыпу "пугі і перніка". Аднак вынікаў гэта не дало. На думку Б.Квінкерт, пачынаючы з восені — зімы 1941 г. нямецкая прапаганда ўсё больш саступала ў сваім уплыве савецкай контрпрапагандзе, асабліва пасля таго, як беларускім партызанам удалося наладзіць уласную сістэматычную прапагандысцкую дзейнасць (с. 199).

У наступным раздзеле Б.Квінкерт разглядае "прапаганду спраў", пад лозунгам якой праходзіў 1942 год. У гэты час адбылася "грунтоўная мадыфікацыя палітычна-прапагандысцкіх падыходаў" нацыстаў (с. 201). Пры гэтым даследчыца заўважае, што мадыфікацыя гэтая не з'яўлялася прамой рэакцыяй на пачатак савецкага контрнаступлення і ўступленне ў вайну Злучаных Штатаў Амерыкі. Яшчэ да гэтых падзей ідэолагі нацысцкай Германіі зацвердзілі праграму мер, сярод якіх значыліся наступныя: адбудова мясцовага кіравання на аснове правядзення гаспадарчых мерапрыемстваў (у першую чаргу аграрнай рэформы); уключэнне насельніцтва ў сістэму мясцовага кіраўніцтва Беларусі ў рамках кансалідацыі і самавызначэння беларускага народа насуперак рускім і палякам; талерантнасць у рэлігійнай палітыцы; культурнае развіццё; рэгулярнае забеспячэнне мясцовых жыхароў газетамі і часопісамі; стварэнне ўласных узброеных фарміраванняў; актыўная вусная прапаганда вопыту паездак беларусаў у Германію (с. 205—208).

Кожны з азначаных напрамкаў новай прапагандысцкай палітыкі нацыстаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі паказаны на шырокім дакументальным матэрыяле, галоўным чынам нямецкага паходжання. Разглядаючы выкарыстанне прапагандыстаў у ходзе правядзення буйных карных акцый, даследчыца робіць выснову, што з канца лета 1942 г. галоўнай задачай нацыстаў на акупаванай тэрыторыі становіцца барацьба супраць партызан. Яны зразумелі, што мясцовае насельніцтва можна прыцягнуць на свой бок толькі спалучаючы палітычныя,

прапагандысцкія меры і метады тэрору (с. 246). Пры гэтым прапаганда ўпершыню выдзяляла розныя групы сярод насельніцтва і партызан: па інфармаванасці насельніцтва; па падтрымцы партызан, па сувязях з часткай насельніцтва, якое знаходзіцца ў партызанах; па ўласнаму звароту да партызан. Партызаны былі падзелены на дзве групы: 1) тыя, з кім можна вырашаць пытанні толькі з выкарыстаннем зброі; 2) тыя, з кім можна весці і прапагандысцкую барацьбу (с. 251). 11 лістапада 1942 г. была выдадзена дырэктыва аб спыненні акцый помсты супраць мясцовага насельніцтва і замене іх *мэтавым тэрорам* (выдзелена ў тэксце. — **С.Н.**). Інакш кажучы, мэтанакіраваныя акцыі тэрору павінны былі праводзіцца з узмоцненай прапагандысцкай актыўнасцю, каб прымусіць насельніцтва да супрацоўніцтва з нацыстамі ў барацьбе супраць партызан (с. 257).

Разглядае Б.Квінкерт і дзейнасць прапагандысцкіх службаў у гаспадарчай сферы. У першую чаргу яна тычылася павелічэння памераў прысядзібных участкаў і правядзення ў сярэдзіне лютага 1942 г. аграрнай рэформы. З гэтай нагоды прапагандысцкія службы нацыстаў падрыхтавалі шматлікія агітацыйныя матэрыялы (значная частка іх адлюстравана на ўнутраных каляровых уклейках кнігі). Вывучаючы гэтыя матэрыялы, даследчыца прыйшла да высновы, што "абмежаваны эфект" рэформы (с. 230) быў абумоўлены няўдалай прапагандай нацыстаў.

Наступным "прапагандысцкім полем", дзе акупацыйныя ўлады не здолелі дасягнуць тых поспехаў, на якія спадзяваліся, была вярбоўка беларускага насельніцтва на работы ў Германію. Усяго з акупаванай тэрыторыі Беларусі ў нямецкі рэйх было вывезена амаль 380 тыс. чалавек.

Ацэньваючы рэакцыю насельніцтва на праведзеныя да канца 1942 г. прапагандысцкія кампаніі, Б.Квінкерт робіць наступныя высновы. Партызанам, як правіла, не ўдавалася перасцерагчы мірнае насельніцтва ад карных аперацый, акцый запалохвання, нарыхтоўчых і вярбовачных кампаній акупантаў. У той жа час антыпартызанская прапаганда з мэтай расколу беларускага насельніцтва скончылася практычна поўнай няўдачай (с. 270).

У заключным раздзеле трэцяй часткі аўтар даследуе "ментальнае" вядзенне вайны ў 1943—1944 гг., калі адбыліся прынцыповыя змены на савецка-германскім фронце. У гэты час пачалася суцэльная мабілізацыйная кампанія супраць бальшавізму ў рамках пабудовы гітлераўскай "новай Еўропы". Яшчэ на рубяжы 1942—1943 гг. начальнікам штаба вермахта Кейтэлем быў аб'яўлены "прапагандысцкі план зімы 1942/43 гг.", які прадугледжваў правядзенне вялікай акцыі "ад рускага да рускага" (с. 280). Сутнасць гэтай акцыі заключалася ў пашырэнні маштабаў прыцягнення мясцовых сіл для стварэння прагерманскіх вайсковых фарміраванняў. На думку Б.Квінкерт, у прапагандзе нацыстаў на захопленых усходніх тэрыторыях адбылася змена парадыгмы. Калі ў адпаведнасці з папярэднімі нацысцкімі падыходамі праводзілася татальная германізацыя ўсходнееўрапейскіх тэрыторый, то новая парадыгма прадугледжвала ўключэнне насельніцтва акупаванай савецкай тэрыторыі ў "новую Еўропу" ў якасці раўназначных партнёраў. Для гэтага прадугледжвалася палепшыць адносіны да остарбайтараў, ваеннапалонных і жыхароў акупаваных усходніх тэрыторый.

Правядзенне такой палітыкі ў Генеральнай акрузе Беларусь прывяло да з'яўлення новых арганізацыйных утварэнняў, такіх як "Беларускія прафсаюзы", "Беларускія працуючыя жанчыны", "Саюз беларускай моладзі" (22 чэрвеня 1943 г.), "Беларуская рада даверу" (27 чэрвеня 1943 г.), "Беларускае навуковае таварыства" (да верасня 1943 г.), "Беларуская цэнтральная рада" (21 снежня 1943 г.), "Беларускае культурнае таварыства" (6 лютага 1944 г.), "Беларуская самаабарона" (6 сакавіка 1944 г.) і "Беларуска-нямецкае ўпраўленне па навуцы і даследаваннях" (май—чэрвень 1944 г.). Галоўная мэта іх дзейнасці бачылася ў фарміраванні "беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці" пры непасрэдным удзеле акупацыйнага прапагандысцкага апарату.

Разглядаючы дзейнасць "Саюза беларускай моладзі", Б.Квінкерт прыйшла да высновы, што ўтварэнне гэтага аб'яднання нельга разглядаць як вынік нямецкай прапаганды. Такое меркаванне было хутчэй штучна навязана, чым адпавядала рэчаіснасці. З аднаго боку, саюз быў інструментам, пры дапамозе якога акупацыйныя ўлады хацелі актывізаваць нацыянальны рух, а з другога боку, і гэта даследчыца лічыць галоўным, саюз садзейнічаў кантролю за ўлікам і выкарыстаннем беларускай моладзі ў якасці працоўнай сілы. Пры гэтым аўтар адзначае, што агульная колькасць членаў саюза дасягнула да лета 1944 г. амаль 40 тыс. чалавек, з іх 5 тыс. у Баранавічах (с. 304).

Аналізуючы дзейнасць "Беларускай цэнтральнай рады" і "Беларускай краёвай абароны" Б.Квінкерт робіць выснову, што на фоне правядзення гэтымі ўтварэннямі пэўнай беларускай палітыкі галоўнай для акупантаў заставалася задача мабілізаваць мясцовае насельніцтва на барацьбу з партызанамі (с. 311).

Па меры наступлення Чырвонай Арміі нацысцкая прапаганда ўсё актыўней далучала да антысавецкай прапаганды нацыянальныя заклікі. Яна імкнулася пераканаць беларусаў у тым, што адзіны шанс на выжыванне — гэта актыўная падтрымка нямецкага боку (с. 318).

У 1943 г. адной з галоўных праблем для акупацыйных улад з'яўляўся партызанскі рух. Яны разумелі, што эфектыўная палітыка бяспекі на захопленай тэрыторыі не павінна цалкам абапірацца на акцыі тэрору. Лепей было б схіліць частку насельніцтва да супрацоўніцтва. На думку даследчыцы, пры дапамозе прапагандысцкіх кампаній вёўся захоп рабочай сілы, якая трапляла да немцаў падчас правядзення антыпартызанскіх аперацый. Разглядаючы новую стратэгію барацьбы з партызанамі, якая была ўведзена на рубяжы 1943—1944 гг. і звязана са стварэннем апорных пунктаў і ахоўных вёсак,

Б.Квінкерт прыходзіць да высновы, што прапагандысцкія мерапрыемствы з'яўляліся адной з важных частак па рэалізацыі гэтага праекта (с. 338).

Характарызуючы нямецкую прапаганду ў сферы гаспадаркі на заключным этапе акупацыі, даследчыца гаворыць аб тым, што прапаганда ў аграрнай сферы заставалася цэнтральнай тэмай для розных інстанцый на тэрыторыі Беларусі. Што тычыцца вярбоўкі мясцовага насельніцтва на работы ў рэйх, то тут намеціліся новыя тэндэнцыі. Беларусам паказвалі наглядны матэрыял і фільмы аб паляпшэнні ўмоў пражывання остарбайтараў у Германіі. Асновай для вярбоўкі беларускай моладзі станавілася спалучэнне прапаганды і прымусу. У манаграфіі паказана, што прымусовыя меры былі неабходны падчас акцый, звязаных з вывазам дзяцей ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў і падлеткаў. Летам 1944 г. нямецкае кіраўніцтва аб'явіла аб вывазе з вобласці армейскага тылу дзяцей, якія не мелі даху над галавой, засталіся без бацькоў і сродкаў пражывання (панямецку HEU-Aktion. — **С.Н.**). Паводле дакументаў, у рамках гэтай акцыі з Беларусі ў рэйх было вывезена не менш за 2,5 тыс. дзяцей (с. 350).

Аўтар распавядае аб прапагандысцкіх акцыях на беларускай зямлі ў ходзе "нямецкай эвакуацыі", г. зн. адступлення немцаў. Яна прыводзіць прыклады прыцягнення мясцовага насельніцтва да прымусовых работ і робіць падлікі, што для Беларусі гэта азначала перасяленне каля аднаго мільёна чалавек (с. 352). Аднак на практыцы толькі невялікая частка насельніцтва згадзілася на эвакуацыю, большасць жа людзей хаваліся ў лясах (с. 353).

У канцы трэцяй часткі сваёй працы Б.Квінкерт дае азначэнне і характарыстыку паняццю "ментальнае куратарства" прапагандыстаў. Такое куратарства распаўсюджвалася на мясцовае насельніцтва, якое ў той ці іншай ступені добраахвотна супрацоўнічала з нацыстамі ці трапіла на ўлік у выніку прымусу. Аўтар выдзяляе сярод гэтага насельніцтва некалькі груп. У першую ўваходзіць мясцовая "рабочая сіла", якая працавала на розных прадпрыемствах, чыгунцы, пошце, у будаўнічай арганізацыі Тодта, Цэнтральным гандлёвым таварыстве "Усход" і г.д. Для іх была створана спецыяльная вытворчая прапаганда. Другую групу складалі тыя, хто служыў у паліцэйскіх фарміраваннях (дапаможнай паліцыі ці паліцыі парадку). Сярод іх неабходна было весці сістэматычную прапагандысцкую работу і рэгулярнае навучанне. Трэцюю, найбольш вялікую групу, складалі людзі, захопленыя падчас карных аперацый. Іх выкарыстоўвалі на прымусовых работах. Нарэшце, да чацвёртай групы адносіліся бежанцы ці эвакуіраваныя. Штодзённае жыццё мясцовых рабочых ці прыцягнутых да прымусовых работ людзей праходзіла ва ўмовах цяжкай працы, дэфіцыту ўсяго неабходнага, галечы і смерці. Аўтар прыходзіць да высновы, што задачы па "куратарстве" ляжалі на плячах мясцовых прапагандыстаў, большасць з якіх складалі жанчыны (с. 359).

У заключэнні манаграфіі Б.Квінкерт дае сваю ацэнку "ментальнаму вядзенню вайны" на тэрыторыі Беларусі. Яна адзначае, што, па ацэнках саміх арганізатараў прапаганды, на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь у 1943—1944 гг. нацысцкая прапаганда мела негатыўныя наступствы. Немцы не здолелі ні сфарміраваць у мясцовага насельніцтва станоўчае стаўленне да сябе, ні перашкодзіць яго няспыннаму адыходу да партызан (с. 366). Сваёй прапагандай немцам адносна паспяхова ўдавалася ўтойваць асабістую адказнасць за наступствы вайны на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Б.Квінкерт заключае: нямецкая прапаганда ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва і партызан Беларусі была часткай злачыннай акупацыйнай палітыкі (с. 374).

Такім чынам, кніга Бабеты Квінкерт з'яўляецца даследаваннем, пабудаваным на новым фактычным матэрыяле, прысвечаным "ментальнаму вядзенню вайны" на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг. Удалым нам бачыцца тое, што аўтар крок за крокам знаёміць чытача з адметнасцямі нацысцкай прапагандысцкай работы, характар якой у акупаванай Беларусі вызначала яе ўключэнне ў сферу дзейнасці як грамадзянскай, так і армейскай акупацыйнай улады. Бясспрэчнай заслугай працы з'яўляецца высвятленне сутнасці акупацыйнай палітыка-прапагандысцкай работы ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва і партызан Беларусі.

Навуковая праца **"Савецкія партызаны ў 1941—1944 гг.: міфы і рэчаіснасць"** напісана нямецкім гісторыкам польскага паходжання Б.Мусялам, вядомым навуковай грамадскасці па зборніку дакументаў "Савецкія партызаны ў Беларусі 1941—1944: погляд з Баранавіцкай вобласці" (Мюнхен, 2004). У фокусе новай працы знаходзіцца Беларусь як "цэнтр савецкіх партызан і партызанскай вайны". Аўтар прытрымліваецца тэзіса, выказанага ў канцы 1990-х гг. нямецкім гісторыкам Х.Герлахам аб тым, што Беларусь у гады Другой сусветнай вайны ўяўляла "вяршыню" партызанскага руху ў Савецкім Саюзе і Еўропе (с. 11).

Праца складаецца з уводзін, дзевяці раздзелаў з 62 падраздзеламі, эпілогу, а таксама дадаткаў, куды ўключаны заўвагі, спіс скарачэнняў, спіс крыніц і літаратуры, геаграфічны і імянны паказальнікі.

Ва "Уводзінах" (с. 11—37) аўтар расказвае пра гісторыю Беларусі ў 1920—1930-я гг., выяўляе прычыны і паказвае вынікі падрыхтоўкі Савецкай дзяржавы да вядзення партызанскай вайны. Ён прыходзіць да высновы, што Савецкі Саюз быў падрыхтаваны да партызанскай вайны на сваёй тэрыторыі лепей за любую іншую краіну ў свеце (с. 36).

У першым раздзеле "1941-ы год: цяжкі пачатак" (с. 38—83) Б.Мусял разглядае наступствы прарыву немцамі савецкай абароны на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Ва ўмовах германскай акупацыі савецкае кіраўніцтва выступіла з заклікам да народаў СССР аб правядзенні розных мер па абароне краіны, у тым ліку разгортванні партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі. У даследаванні адзнача-




ецца вялікая работа, праведзеная "навучальным і аператыўным цэнтрам", які быў створаны ў Гомелі ў пачатку ліпеня 1941 г. Ён адыграў важную ролю ў падрыхтоўцы партызан і дыверсійных груп. Нямецкі даследчык не згодзен з падыходамі савецкай гістарыяграфіі, якая не надавала належнай увагі гэтаму фактычна першаму падрыхтоўчаму цэнтру партызанскай барацьбы на савецкай тэрыторыі (с. 49).

Аўтар вызначае ролю партыйных і савецкіх органаў (у тым ліку НКУС/НКДБ) у арганізацыі партызанскай барацьбы, разглядае значэнне вопыту стварэння знішчальных батальёнаў і партызанскіх фарміраванняў з чырвонаармейцаў. Ён прыходзіць да важнай высновы, што да канца 1941 г. на беларускай тэрыторыі засталася толькі нязначная частка атрадаў і груп, якія вялі баявую дзейнасць супраць нацысцкіх захопнікаў (с. 67). Б.Мусял лічыць, што адмоўную ролю пры стварэнні партызанскіх атрадаў і баявых груп адыгралі дылетантызм і недахоп уласнай матывацыі ў саміх жыхароў. Аўтар перакананы, што не менш значным фактарам складвання такой сітуацыі з'яўлялася таксама адсутнасць надзейнай падтрымкі партызан сярод насельніцтва (с. 76).

Другі раздзел манаграфіі называецца "Пачатак 1942 года: рубеж партызанскага руху ў Беларусі" (с. 84—146). Аўтар адзначае, што ў сваім развіцці партызанскі рух прайшоў розныя стадыі: ад спантаннага ўзнікнення фарміраванняў да пераўтварэння іх у баяздольныя атрады. Ядро партызанскіх фарміраванняў складалі акружэнцы і былыя савецкія ваеннапалонныя, якія адыгралі вырашальную ролю ў павелічэнні колькасці атрадаў і ўдзельнікаў супраціўлення. Савецкая ўлада імкнулася ўсталяваць кантроль і наладзіць агульнае кіраўніцтва актыўна растучымі партызанскімі сіламі. Гітлер жа, са свайго боку, абвясціў аб правядзенні актыўнай барацьбы і жорсткіх акцый супраць партызан (с. 142).

Трэці раздзел кнігі "Цэнтральны штаб партызанскага руху (май 1942 — студзень 1944 гг.)" прысвечаны разгляду дзейнасці арганізацыйнага цэнтра савецкага партызанскага руху, які ўзначальваў П.Панамарэнка. Ён з'яўляўся адным з распрацоўшчыкаў канцэпцыі партызанскай барацьбы як "усенароднага руху" (с. 148). Рашэнне аб стварэнні Цэнтральнага штаба было прынята 30 мая 1942 г. У адпаведнасці з рашэннем Дзяржаўнага камітэта абароны ствараліся рэспубліканскія і франтавыя штабы. З кастрычніка 1942 г. тэрыторыя рэспублікі знаходзілася ў сферы дзейнасці Беларускага штаба партызанскага руху на чале з П.Калінінам, створанага ў верасні 1942 г.

Аўтар разглядае асноўныя напрамкі дзейнасці двух штабоў партызанскага руху. Адной з галоўных задач, якую партызанскія фарміраванні павінны былі вырашаць пастаянна, з'яўлялася забеспячэнне часцей Чырвонай Арміі дакладнымі звесткамі аб колькасным складзе, дыслакацыі і перамяшчэнні варожых войскаў. Б.Мусял лічыць, што вузлавым момантам новага этапу арганізацыі партызанскага руху павінна было стаць усталяванне сувязі штабоў з партызанскімі атрадамі, што дыслацыраваліся ў цэнтральнай, паўднёвай і заходняй частках Беларусі (с. 158). Ён перакананы, што адсутнасць сувязі азначала адсутнасць партыйнага кіраўніцтва партызанамі, якое планавалася наладзіць з восені 1942 г. па май 1943 г. Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху садзейнічала выпрацоўцы адзінай стратэгіі партызанскай вайны. У працы адзначаецца, што з канца лета 1942 г. сабатаж на дарогах і чыгунках быў аб'яўлены галоўнай задачай партызан. Аднак у пачатку 1943 г. І.Сталін прыняў рашэнне аб роспуску Цэнтральнага штаба партызанскага руху і перадачы кіраўніцтва партызанскім рухам адпаведным партыйным органам і рэгіянальным штабам. Б.Мусял лічыць, што галоўнай прычынай такога рашэння стала меркаванне І.Сталіна аб поўным выкананні Цэнтральным штабам адведзенай для яго ролі (с. 173). Аднак літаральна праз месяц дзейнасць штаба была адноўлена. Паводле дакументаў, канчаткова Цэнтральны штаб партызанскага руху быў ліквідаваны толькі ў студзені 1944 г., калі была вызвалена частка тэрыторыі Беларусі.

У чацвёртым раздзеле "1943 год: вышэйшая кропка партызанскага руху" (с. 176—219) аўтар раскрывае арганізацыйную структуру партызанскага руху, паказвае тэрытарыяльнае размяшчэнне партызан. На багатым дакументальным матэрыяле паказана панарама дзейнасці партызанскіх фарміраванняў ва ўмовах стварэння партызанскіх зон. Асабліва важным нам бачыцца падраздзел, у якім аўтар спрабуе высветліць ваеннае значэнне дзейнасці беларускіх партызан у 1943 г. Аналізуючы нямецкія дакументы, ён адзначае, што павелічэнне колькасці партызан ні ў якім разе не азначала адпаведнага павышэння іх баявой актыўнасці і паляпшэння эфектыўнасці партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Пэўным пацвярджэннем гэтага даследчык лічыць і шматлікія буйныя карныя акцыі, ахвярамі якіх у большасці сваёй станавіліся не столькі партызаны, колькі мірнае насельніцтва (с. 219).

Пяты раздзел кнігі мае назву "Рэйкавая вайна 1943/1944 гадоў". У ім Б.Мусял крытычна ставіцца да даных, якія сведчылі аб выніковасці гэтай апера-

цыі, праведзенай у тры этапы. Паводле звестак Цэнтральнага штаба партызанскага руху, вынікам двух этапаў рэйкавай вайны ў жніўні — кастрычніку 1943 г. стала знішчэнне савецкімі партызанамі 345 356 рэек агульнай даўжынёй аднакалейкі ў 2 158 км. Паводле ж нямецкіх дакументаў, агульная даўжыня рэек, знішчаных партызанамі на працягу трох месяцаў 1943 г., складала толькі каля 300 км аднакалейкі (с. 224). Нямецкі даследчык заўважае, што далейшы пошук гістарычнай ісціны ў гэтым пытанні магчымы толькі на аснове супастаўлення дакументаў двух бакоў, а не выкарыстання выключна звестак Цэнтральнага штаба партызанскага руху (с. 230).

Шосты раздзел кнігі "Партызанская барацьба: разведка, контрразведка, баявое выкарыстанне, дысцыпліна, забеспячэнне і страты" (с. 231—297) прысвечаны штодзённасці партызанскага руху. Аснову яе складала не толькі баявая дзейнасць партызан, але таксама фактычныя наступствы яе для мірнага насельніцтва. Аўтар паказвае вынікі дзейнасці ваеннай разведкі, раскрывае ролю асобых аддзелаў і контрразведкі ў ходзе арганізацыі партызанскага руху, характарызуе формы барацьбы партызан супраць мясцовага "самакіравання" і нямецкага персаналу, які быў задзейнічаны ў органах мясцовага кіравання і сельскагаспадарчых службах. У асобны падраздзел аўтар вылучае вынікі дзейнасці партызан па разлажэнню мясцовай паліцыі і мясцовых фарміраванняў.

Сярод пытанняў, разгледжаных аўтарам, асаблівую цікавасць выклікае пытанне аб стратах партызан, з аднаго боку, і немцаў — з другога. Гэтае пытанне і сёння з'яўляецца дыскусійным у гістарыяграфіі, паколькі даследчыкам не ўдаецца прыйсці да кансэнсусу пры правядзенні колькасных падлікаў агульных страт. Паводле савецкіх звестак, на тэрыторыі Беларусі загінулі 25 681 партызан, 11 697 прапалі без вестак і 1 030 трапілі ў палон. Адпаведна нямецкім дакументам, за гады вайны партызаны толькі ў зоне тылу групы армій "Цэнтр" (тэрыторыя цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. — **С.Н.**) панеслі страты ў 94 191 чалавек (с. 290). Аўтар адзначае, што такія разыходжанні ў ацэнках агульных страт партызан маюць свае прычыны. Іх трэба шукаць у факце далучэння да ліку забітых партызан мірных жыхароў, якія сталі ахвярамі антыпартызанскіх аперацый нямецкіх акупацыйных улад. Што тычыцца страт нямецкага боку, то, паводле звестак Цэнтральнага штаба партызанскага руху, на тэрыторыі Беларусі немцы ў ходзе партызанскай дзейнасці страцілі 464 тыс. чалавек. Паводле нямецкіх даных, агульная колькасць панесеных страт вагаецца ад 54 да 57 тыс. чалавек. Асноўную прычыну такіх разыходжанняў Б.Мусял бачыць у прыпісках, якія былі амаль абавязковым элементам партызанскай статыстыкі (с. 292).

У сёмым раздзеле "Партызанскі рух у Беларусі ў 1944 годзе" (с. 298—317) аўтар раскрывае дзейнасць партызан на тэрыторыі асобных рэгіёнаў Беларусі, у тым ліку ў Палескай, Мінскай і Віцебскай абласцях. Тут нацысцкія акупанты правялі з удзелам вайсковых часцей буйныя антыпартызанскія акцыі, якія прывялі да ліквідацыі асобных партызанскіх зон. Б.Мусял адзначае, што баявая актыўнасць партызан значна ўзрасла з пачаткам наступальнай аперацыі "Баграціён". Паводле савецкіх звестак, па стану на 1 чэрвеня 1944 г. на тэрыторыі Беларусі вялі баявую дзейнасць 759 партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю 143 тыс. чалавек, якія былі ўзброены 82 423 вінтоўкамі, 25 565 аўтаматамі, 5 070 лёгкімі і цяжкімі кулямётамі, 482 мінамётамі, 381 супрацьтанкавай гарматай, 123 гарматамі і 11 995 пісталетамі (с. 312). Аднак па незразумелых прычынах аўтар прыходзіць да супярэчлівай высновы, што нягледзячы на баявы патэнцыял, партызаны ў Беларусі ў ходзе аперацыі "Баграціён" не адыгралі асабліва істотнай ролі ў справе знішчэння вайсковых часцей групы армій "Цэнтр". Вызваленне беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прывяло да спынення дзейнасці партызанскіх фарміраванняў. Адна частка іх удзельнікаў улілася ў рады Чырвонай Арміі, другая была накіравана на партыйную, савецкую і гаспадарчую работу ў Савецкай Беларусі.

У восьмым раздзеле "Да сацыяльнай гісторыі савецкага партызанскага руху ў Беларусі" (с. 318—367) Б.Мусял закранае шэраг аспектаў адной з маладаследаваных у айчыннай гістарыяграфіі тэм. Ён разглядае асабовы склад партызанскага руху, этнічную і сацыяльную прыналежнасць яго ўдзельнікаў, вызначае колькасць жанчын сярод партызан. Не абмінае даследчык сваёй увагай і пытанне аб штодзённым жыцці партызан, у якім існавалі не толькі дысцыпліна і парадак, але мелі месца і іншыя з'явы. Б.Мусял упэўнены, што без дэталёвага ведання гісторыі штодзённасці не можа быць напісана поўная карціна партызанскага руху. Значную каштоўнасць мае прыведзеная табліца, дзе на падставе партызанскіх звестак адлюстраваны статыстычныя даныя аб развіцці партызанскага руху ў Беларусі з чэрвеня 1942 г. па чэрвень 1944 г.

Заключны, дзявяты раздзел кнігі называецца "Насельніцтва ў партызанскай барацьбе: беларусы, яўрэі, палякі" (с. 368—436). Даследуючы гэтыя аспекты гісторыі партызанскага руху, гісторык зыходзіць з тэзіса, што мясцовае насельніцтва знаходзілася паміж двума "франтамі": нацысцкім акупацыйным рэжымам, з аднаго боку, і партызанскім рухам — з другога. Аўтар спрабуе высветліць наступствы ваеннага часу для трох галоўных этнічных груп насельніцтва Беларусі — беларусаў (6,3 млн чалавек), палякаў (каля 1,5 млн чалавек) і яўрэяў (амаль 680 тыс. чалавек). У той жа час незразумела, чаму аўтар не вызначае характар нацысцкай палітыкі ў дачыненні да рускіх і не расказвае аб іх ролі ў партызанскім руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Выяўляючы страты сярод мірнага беларускага насельніцтва, Б.Мусял адзначае, што абодва бакі трымаліся прынцыпу "Хто не з намі, той супраць нас". На падставе нямецкіх дакументаў ён паказвае, што агульная колькасць ахвяр сярод мірнага насельніцтва склала 345 тыс. чалавек (с. 377). Пры гэтым

даследчык заўважае, што ў гэтую лічбу не ўключаны страты беларускіх партызан. Высвятляючы наступствы нацысцкай акупацыі для беларускіх яўрэяў, Б.Мусял прыходзіць да высновы, што з моманту нападу Германіі на СССР і да заканчэння вайны на тэрыторыі Беларусі было знішчана каля 500 тыс. яўрэяў. Выжыць ва ўмовах татальнага генацыду ўдалося толькі эвакуіраваным на ўсход яўрэям, а таксама некальнім тысячам з тых, хто вёў партызанскую барацьбу супраць акупантаў.

Аўтар даволі падрабязна разглядае стаўленне палякаў да савецкага партызанскага руху, высвятляе асноўныя прычыны, што прывялі да ўзнікнення варожасці і пачатку ўзброенай барацьбы паміж польскімі фарміраваннямі і савецкімі партызанамі. Б.Мусял паказвае палітыку нацыстаў у адносінах да польскага насельніцтва і параўноўвае яе з савецкай палітыкай на прыкладзе адносін да пытання аб Заходняй Беларусі. Абвастрэнне адносін пачалося ў канцы красавіка 1943 г. пасля рашэння кіраўніцтва СССР спыніць дыпламатычныя адносіны з польскім урадам у эміграцыі. Ва ўмовах эскалацыі польска-савецкага канфлікту ў раёнах Вілейкі, Ліды, Навагрудка і Баранавічаў была распачата "рэгіянальная польска-савецкая партызанская вайна" (с. 428). Паводле няпоўных даных, байцы Арміі Краёвай акругі Навагрудак правялі 459 аперацый супраць немцаў і ўдзельнічалі ў 355 аперацыях супраць савецкіх партызан. Б.Мусял лічыць, што ад канфлікту паміж палякамі і савецкімі партызанамі выйгралі нацысты. У той жа час у манаграфіі прыведзены новыя дакументы, якія ставяць пад сумненне абвінавачанні ў дачыненні да Арміі Краёвай як "фашысцкіх калабарацыяністаў" і "нямецкіх агентаў" (с. 433).

Б.Мусял перакананы, што прыведзеныя ў кнізе асобныя негатыўныя факты ні ў якім разе не змяншаюць заслугі савецкіх партызан, якія ва ўмовах акупацыі дзейнічалі храбра і рашуча, вялі несупынную барацьбу з акупантамі за вызваленне сваёй краіны. У той жа час факты ўпарта сведчаць, што беларускія партызаны заплацілі вялікую цану за ўзброеную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Настаў час, калі гэта павінна ведаць усё беларускае грамадства, а не толькі вузкае кола навукоўцаў.

У "Эпілогу" (с. 437—443) Б.Мусял прапануе чытачу высновы, да якіх прыйшоў на аснове крытычнага аналізу тых дакументальных матэрыялаў, што сталі вядомымі айчынным і замежным даследчыкам толькі ў выніку "архіўнай рэвалюцыі" канца ХХ ст. Аўтар перакананы, што сапраўднае навуковае даследаванне савецкага партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі можна напісаць толькі на аснове новых крыніц. Мы падтрымліваем ідэю нямецкага даследчыка аб важнасці выкарыстання новых магчымасцей для аб'ектыўнага даследавання кожнага з пытанняў гісторыі ваеннай паўсядзённасці, у тым ліку гісторыі ўзброенага супраціўлення ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У той жа час асобныя высновы Б.Мусяла падаюцца нам спрэчнымі: 1) аб недастатковым забеспячэнні партызан боепрыпасамі; 2) іх невысокай баявой эфектыўнасці; 3) аб няўдачы савецкага кіраўніцтва па стварэнні другога фронту ў тыле нямецкіх войскаў і іншыя (с. 442).




Праца А.Бракеля **"Пад чырвонай зоркай і свастыкай: Баранавічы ў 1939—1944 гг. Заходняя Беларусь пад савецкай і германскай акупацыяй"** прысвечана рэгіянальнай гісторыі Беларусі. У даследаванні раскрыты малавядомыя аспекты гісторыі ўсходніх тэрыторый былой ІІ Рэчы Паспалітай і новаўтворанай Баранавіцкай вобласці, дзе з 1939 па 1944 г., на яго думку, вызначальнымі з'яўляліся падзеі савецкай анексіі, германскай акупацыі і пасляваеннай саветызацыі. Аўтар манаграфіі адзначае, што на працягу двух перадваенных гадоў і трох гадоў акупацыі насельніцтва Баранавіцкай вобласці і Баранавіцкай акругі знаходзілася ў фокусе антаганістычных светапоглядаў дзвюх сістэм і перажыло цяжкія наступствы панавання дзвюх улад. Ён вылучае жыццё мясцовага насельніцтва на працягу пяці гадоў у якасці галоўнага прадмета вывучэння, не пакідае па-за рамкамі сваёй грунтоўнай працы шэраг пытанняў, якія да гэтага часу спецыяльна не разглядаліся не толькі ў нямецкай, але і ў беларускай гістарыяграфіі.

Манаграфія з'явілася вынікам шматгадовага навуковага пошуку нямецкага гісторыка. Зазначым, што дакументальная база для даследавання выяўлена ім у 84 фондах архіваў у Баранавічах, Берліне, Брэсце, Варшаве, Людвігсбургу, Мінску і Фрайбургу.

Работа складаецца з уводзін, пяці частак, некаторыя з якіх падзелены на раздзелы і больш дробныя падраздзелы, заключэння, спісаў скарачэнняў, крыніц і літаратуры, імяннога паказальніка.

Ва "Уводнай частцы" (с. 1—14) аўтар праводзіць агляд даследаванняў, якія прама ці ўскосна закранулі асобныя аспекты гісторыі Заходняй Беларусі ў савецкі час і гады нацысцкай акупацыі, і характарызуе дакументальныя крыніцы. Абгрунтаваным можна лічыць зварот аўтара да прац польскіх гісторыкаў Ю.Туронка і Б.Мусяла (паляка па паходжанню), нямецкіх даследчыкаў Х.Герлаха, Б.К'яры, П.Коля, амерыканскага гісторыка М.Дзіна, а таксама беларускіх навукоўцаў — С.Барадзіна, І.Яленскай, А.Ка-

валені, А.Літвіна, Я.Розенблата, І.Сервачынскага. Аналіз А.Бракеля сведчыць, што ў сучаснай гістарыяграфіі нямецкім даследчыкам упершыню праводзіцца параўнальны аналіз гістарычных падзей у перадваенны і ваенны час на тэрыторыі адной Баранавіцкай вобласці (Баранавіцкай акругі).

У другой частцы "Крэсы ўсходнія ў ІІ Рэчы Паспалітай" (с. 15—27) аўтар паказвае моўныя і канфесійныя адметнасці мясцовага насельніцтва, выяўляе прыкметы яго нацыянальнага характару. Ён абгрунтоўвае тэзіс аб тым, што ў пачатку 1930-х гг. у Навагрудскім ваяводстве моўная і канфесійная прыналежнасці не былі пастаянныя і вагаліся: 550 тыс. чалавек лічылі сваёй мовай польскую, але толькі 420 тыс. спавядалі рымска-каталіцкае веравызнанне; 413 тыс. размаўлялі па-беларуску, але 542 тыс. мясцовага насельніцтва з'яўляліся праваслаўнымі. У яўрэяў падобных адрозненняў адносна мовы і рэлігіі не назіралася. Даследчык адзначае, што правядзенне ў ІІ Рэчы Паспалітай пэўнай дыскрымінацыйнай палітыкі ў дачыненні да беларускай меншасці прывяло да "абвастрэння грамадскага клімату" (с. 24).

У трэцяй частцы "Баранавічы ў Другой сусветнай вайне" (с. 29—33) А.Бракель дае кароткі агляд галоўных падзей у гэтай мясцовасці ў пачатку вайны. З верасня 1939 г. тут адбываліся падзеі, якія пакінулі істотны след у жыцці насельніцтва Баранавіцкай вобласці, у склад якой у студзені 1940 г. былі канчаткова ўключаны 27 беларускіх раёнаў. Пасля ўваходжання вобласці ў склад БССР на яе тэрыторыі пачалася "маштабная саветызацыя". Аднак ужо ў чэрвені 1941 г. Баранавіцкая вобласць трапіла пад акупацыю немцаў. У верасні 1941 г. быў створаны акруговы камісарыят Баранавічы, у які ўваходзілі Навагрудак, Клецк, Ляхавічы, Мір, Нясвіж, Новая Мыш, Стоўбцы і г. Баранавічы.

На гэтай тэрыторыі пачалі адбывацца наступныя падзеі: па-першае, вынішчэнне яўрэяў; па-другое, разгортванне партызанскага руху; па-трэцяе, актывізацыя барацьбы польскага супраціўлення — Арміі Краёвай. У такіх умовах немцы дзейнічалі вельмі жорстка, аднак адначасова спрабавалі ўключыць мясцовае насельніцтва ў сістэму новых адносін. Такое становішча доўжылася да 8 ліпеня 1944 г., калі Баранавічы былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і пачалася рэсаветызацыя вобласці.

У чацвёртай частцы "Нацыянальная палітыка і нацыянальныя канфлікты" (с. 35—145), якая ўключае два раздзелы, А.Бракель спрабуе прааналізаваць адносіны паміж палякамі, яўрэямі і беларусамі ў часы савецкай улады і нацысцкай акупацыі. У першым раздзеле ён разглядае нацыянальную палітыку савецкай улады з 1939 па 1941 гг. У гэты час былі распачаты акты гвалту ў дачыненні ў першую чаргу да "старой польскай эліты" (с. 43), якая лічылася "класавым ворагам" (с. 45). Агульная колькасць высланых з тэрыторыі Баранавіцкай вобласці восенню 1939 г. складала 16 693 чалавекі. У пачатку 1940 г. адбыліся новыя дэпартацыі на ўсход. 63,5% ад усіх дэпартаваных складалі палякі, 22,2,% — яўрэі, 7,9% — украінцы і толькі 6,3% — этнічныя беларусы. Аўтар прыходзіць да высновы, што ў ходзе дэпартацый адбывалася шчыльнае перапляценне розных катэгорый дэпартаваных па палітычных, сацыяльных і этнічных прыкметах, але тычылася гэта галоўным чынам палякаў, а не яўрэяў і беларусаў.

Для абгрунтавання сваіх дзеянняў савецкая ўлада актыўна прапагандавала новую кадравую палітыку, ухваляючы вызваленне рабочых і сялян ад "панскай", капіталістычнай эксплуатацыі (с. 58). Яна прыцягвала на кіруючыя пасады выхадцаў з усходняй Беларусі — "усходнікаў" (с. 69). Асаблівая ўвага надавалася школьнай і адукацыйнай палітыцы. Савецкая ўлада імкнулася, з аднаго боку, забяспечыць усім сацыяльным слаям доступ да адукацыі, а з другога — уплываць праз школьную палітыку на свядомасць і культуру мясцовага насельніцтва.

Цікавым падаецца матэрыял, дзе А.Бракель даследуе пытанне аб супрацоўніцтве яўрэяў з органамі савецкай улады. Да канца 1940 г. у Баранавіцкую вобласць было накіравана 8 606 "усходнікаў", з якіх 4 тыс. складалі беларусы, 3 тыс. — рускія, і толькі 875 — яўрэі (с. 89). Зыходзячы з гэтай інфармацыі, гісторык прыходзіць да высновы, што разгляд яўрэяў як "савецкіх калабарацыяністаў" з'яўляецца не больш чым стэрэатыпам (с. 90). На самай справе ў дачыненні як да асобных яўрэяў, так і яўрэйскай меншасці дзейнічалі існуючыя забабоны.

Адказваючы на пытанне аб адносінах паміж нацыянальнымі групамі ў 1939—1941 гг., даследчык зыходзіць з тэзісу аб магчымасці існавання пэўнага канфлікту па прычыне падзелу грамадства на пераможцаў і пераможаных, прыхільнікаў і праціўнікаў новага парадку. Пагаршэнне умоў жыцця для розных катэгорый насельніцтва даволі хутка прывяло да сітуацыі, калі першапачатковае захапленне ад савецкай улады пачало змяншацца як сярод часткі беларускага, так і сярод часткі яўрэйскага насельніцтва (с. 94).

У другім раздзеле паказана нацыянальная палітыка нацысцкіх акупантаў у 1941—1944 гг. Аўтар зыходзіць з тэзіса аб тым, што нацыянальнае пытанне бальшавікі і нямецкія нацыянал-сацыялісты разглядалі па-рознаму. Калі бальшавікі разумелі яго як імкненне да роўнасці ўсіх народаў, то ідэолагі нацыянал-сацыялізму вызначалі ролю кожнага народа ў адпаведнасці з расавай тэорыяй. А.Бракель апісвае трагічны лёс яўрэяў Баранавіцкай акругі. Тут колькасць знішчаных яўрэяў складала паміж 32—43 тыс. чалавек, у тым ліку ад 8,5 да 14 тыс. чалавек у самім Баранавічах (с. 106). Шукаючы адказ на пытанне аб стаўленні мясцовага насельніцтва да праяў Халакосту, аўтар прыходзіць да высновы, што даць абагульняючую ацэнку ў дачыненні да пазіцыі неяўрэйскага насельніцтва адносна лёсу яўрэяў даволі складана. За час нямецкай акупацыі антысемітызм не стаў для мясцовага насельніцтва тым фактарам, які паскорыў бы "працэс вынішчэння яўрэяў" (с. 119).

Сітуацыя ў Баранавіцкай акрузе сведчыла, што ў немцаў фактычна не існавала адзінай пазіцыі адноc-

на палякаў і беларусаў, хоць у пачатку 1942 г. практычна ўсе вядучыя функцыі на ўзроўні мясцовага кіравання замест палякаў выконвалі беларусы. У гэтым кантэксце даволі важнай з'яўляецца выснова аўтара аб фактычнай адсутнасці "вялікіх нацыянальных канфліктаў". Тыя канфлікты, якія ўсё ж мелі месца ў адносінах паміж палякамі і беларусамі, узнікалі на сацыяльнай ці рэлігійнай глебе. Даследчык робіць выснову, што палітыка нацыстаў была ў тысячу разоў горшай за савецкую (с. 145).

Надзвычай цікавая пятая частка даследавання А.Бракеля "Формы супрацоўніцтва з уладамі" (с. 161—244). Сутнасць гэтага супрацоўніцтва раскрываецца на розных фактах добраахвотнага супрацоўніцтва з савецкай уладай у 1939—1941 гг. і з нацысцкай уладай у 1941—1944 гг. Аўтар зыходзіць з тэзіса, што і савецкая, і нацысцкая ўлады кіраваліся адзіным правілам — пошукам падтрымкі сярод мясцовага насельніцтва. Пры гэтым даследчык свядома не выкарыстоўвае тэрмін "калабарацыянізм", уводзячы замест яго такія дэфініцыі, як "супрацоўніцтва" і "кааперацыя".

Разглядаючы супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з савецкай уладай, аўтар вызначае тыя сферы, дзе яно магло адбывацца. У выніку атрымалася шырокая панарама розных відаў супрацоўніцтва ў палітычнай, адміністрацыйнай і гаспадарчай сферах жыцця. Усталяванне нацысцкай акупацыйнай улады з'явілася, на думку аўтара, той вяхой для значнай часткі насельніцтва, якая сведчыла аб спыненні прымусовага прыцягнення сялян у калгасы, ганенняў вернікаў, забароны рэлігіі і дзейнасці царквы. Аднак у хуткім часе мясцовае насельніцтва было вымушана пайсці на прымусовае супрацоўніцтва з нацыстамі. Па прычыне недахопу дакументальных крыніц аўтару не ўдалося вызначыць фактары, што прывялі да добраахвотнага супрацоўніцтва (с. 193). Не абыходзіць А.Бракель увагай і даволі складанае пытанне аб удзеле ў злачынствах тых мясцовых жыхароў, хто пайшоў служыць у дапаможную паліцыю. Агульная колькасць іх у Баранавіцкай акрузе за гады германскай акупацыі складала 2 263 чалавекі (с. 195). Многія мелі непасрэднае дачыненне да злачынстваў нацыстаў на тэрыторыі Баранавіцкай акругі.

Аўтар спрабуе высвятліць галоўныя прычыны ўзброенага супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з немцамі. Ён лічыць, што сярод тых, хто супрацоўнічаў з нацыстамі, можна вылучыць дзве процілеглыя групы. Першая ўключала беларускіх нацыяналістаў, якія бачылі магчымасць весці барацьбу са сваімі ідэйнымі праціўнікамі. Яны лічылі ўзброеныя паліцэйскія фарміраванні першым крокам да стварэння ўласнага беларускага войска (с. 203). Другую групу складалі палякі, якія супрацоўнічалі з акупантамі па нацыянальных перакананнях, з мэтай вяртання тэрыторый, страчаных у 1939 г. Дзеля атрымання зброі палякі ўступалі адначасова і ў нямецкую паліцыю, і ў Армію Краёву.

З ростам актыўнасці партызан, якая павысілася з сярэдзіны 1942 г., значна павялічыўся колькасны склад паліцэйскіх фарміраванняў. Аднак у іх складзе ў параўнанні з першым годам акупацыі практычна зніклі добраахвотнікі. Як вынік, нацысты былі вымушаны звярнуцца да прымусовага рэкрутавання людзей (с. 205).

Адносіны беларускіх нацыяналістаў з нямецкай акупацыйнай уладай аўтар раскрывае на прыкладах супрацоўніцтва з нацыстамі такіх утварэнняў, як "Беларуская нацыянальная самапомач" (с. 206—210), "Беларуская самаабарона" (с. 210—212), "Саюз беларускай моладзі" (с. 214—219), "Беларуская цэнтральная рада" (с. 219—220). Даследчык прыводзіць дакладныя звесткі аб удзеле ў іх жыхароў Баранавіцкай акругі. Цікавым падаецца факт дыскусіі з беларускімі гісторыкамі ў дачыненні да агульнай колькасці беларускай моладзі, што ўваходзіла ў склад "Саюза беларускай моладзі". На думку А.Бракеля, на тэрыторыі Баранавіцкай акругі агульная колькасць удзельнікаў гэтага саюза не перавышала 3 тыс. чалавек (с. 215).

Далей аўтар разглядае факты добраахвотнай кааперацыі і супрацоўніцтва ў сферы гаспадаркі. Ён адзначае, што колькасць тых, хто вымушаны быў пайсці на прымусовае супрацоўніцтва з немцамі, значна большая за колькасць мясцовых грамадзян, хто нёс службу ў паліцыі аховы ці быў уключаны ў сферу мясцовага кіравання. Асновай для рэкрутавання з'яўлялася распараджэнне міністра ўсходніх тэрыторый А.Розенберга аб увядзенні абавязковай працоўнай павіннасці для жыхароў Рэйхскамісарыята Остланд ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, у тым ліку для яўрэяў ва ўзросце ад 15 да 60 гадоў. Тут неабходна звярнуць увагу чытачоў на недакладнасць, дапушчаную ў кнізе ў дачыненні да даты распараджэння: яно было выдадзена не 5 верасня 1941 г. (с. 225), а месяцам раней.

А.Бракель паказвае агульную карціну прыцягнення мясцовага насельніцтва да прымусовых работ. З тэрыторыі Баранавіцкай акругі нацысты дэпартавалі ў рэйх каля 17 тыс. чалавек, альбо 14% ад вывезеных з тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь. Да канца 1943 г. на тэрыторыі Баранавіцкай акругі былі зарэгістраваны 134 тыс. чалавек "мясцовай рабочай сілы", з якіх 95 тыс. былі заняты ў сельскай гаспадарцы (с. 237). У заключэнні пятай часткі даследчык прыходзіць да высновы, што нават пры ўмове наяўнасці фактаў добраахвотнага супрацоўніцтва часткі насельніцтва з савецкай і нацысцкай уладамі прымусовае і гвалтоўнае выкарыстанне мясцовага насельніцтва нацыстамі было непараўнальна большае, чым у савецкай улады (с. 244).

Шостая частка даследавання мае назву "Незадавальненне, адхіленне і супраціўленне мясцовага насельніцтва" (с. 245—380). У ёй А.Бракель аналізуе асобныя факты непрыняцця насельніцтвам савецкай улады і арганізаванага супраціўлення ёй пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, а таксама маштабы ўзброенага супраціўлення нацысцкім акупантам. Даследчык прыходзіць да высновы, што значныя маштабы ўзброенае супраціўленне ўладзе набыло толькі ў гады нацысцкай акупацыі (с. 246).

Паказваючы прычыны незадавальнення мясцовага насельніцтва савецкай палітыкай у галіне сельскай гаспадаркі, А.Бракель аналізуе савецкія пераўтварэнні на вёсцы пасля верасня 1939 г. — стварэнне калгасаў і саўгасаў. Ён палемізуе з некаторымі беларускімі даследчыкамі, якія сцвярджаюць, што большасць батракоў і беднае сялянства выступалі выключна за стварэнне калгасаў. Даследчык пераканаThe, што ў Баранавіцкай вобласці калектывізацыя ішла вельмі марудна, прытым што сама вобласць была лідарам па правядзенні калектывізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Па стане на 1 чэрвеня 1941 г. у калгасы і саўгасы ўвайшлі толькі 6,5% ад усіх сялянскіх двароў (с. 261).

Рашучае непрыняцце мясцовым насельніцтвам нацысцкай палітыкі выразілася ў арганізацыі савецкага партызанскага руху. Паводле нямецкіх дакументаў, актыўная дзейнасць партызан на гэтай тэрыторыі пачынаецца толькі з вясны 1942 г. (с. 286). А.Бракель лічыць, што да ліку важных адметнасцей партызанскай барацьбы на тэрыторыі Баранавіцкай акругі адносіцца стварэнне першага яўрэйскага атрада пад кіраўніцтвам братоў Бельскіх. У той жа час нямецкі даследчык не пагаджаецца з пануючым у беларускай гістарыяграфіі меркаваннем, што летам 1942 г. рух супраціўлення быў "маналітны, скаардынаваны і баяздольны" (с. 288).

Разглядаючы развіццё партызанскага руху восенню 1942 — зімой 1943 г., аўтар прыходзіць да наступнай важнай высновы: у гэты час не толькі павялічылася колькасць партызан і ўзмацнілася іх баяздольнасць, але намеціўся важны элемент — падпарадкаванне веры людзей ідэям Камуністычнай партыі. У гэты ж час на тэрыторыі Баранавіцкай акругі ўзнікла альтэрнатыўная група барацьбітоў — польскае ўзброенае падполле Арміі Краёвай (с. 312). І савецкі партызанскі рух, і польскае ўзброенае падполле бачылі сваім галоўным ворагам нацыстаў, аднак ставілі перад сабой розныя мэты адносна лёсу заходнебеларускіх тэрыторый пасля вайны. На працягу 1943 г. па меры ўзрастання ўплыву савецкага партызанскага руху відавочным станавілася ўзмацненне напружанасці з фарміраваннямі Арміі Краёвай. У далейшым гэта вылілася ў зацятую ўзброеную барацьбу паміж імі.

Значэнне партызанскай вайны А.Бракель спрабуе высветліць на аснове выяўленых у розных архівах і правераных у гістарыяграфічных крыніцах дакументальных фактаў. Паводле дакументаў і найноўшых нямецкіх даследаванняў, не адпавядае рэчаіснасці сцвярджэнне савецкай гістарыяграфіі аб тым, што менавіта наяўнасць партызанскага руху абумовіла размяшчэнне на тэрыторыі Беларусі значных вайсковых сіл немцаў. Па сучасных падліках гэта лічба не пераўзыходзіла 3,8% ад нямецкіх салдат. Аспрэчвае аўтар і лічбу аб колькасці немцаў, забітых партызанамі ў нямецкай тылавой зоне. На яго думку, на працягу вайны савецкія партызаны і падпольшчыкі забілі меншую колькасць нямецкіх салдат, чым іх гінула на працягу аднаго месяца ваенных дзеянняў на ўсходнім фронце (каля 60 тыс. чалавек). Хоць у дачыненні да Баранавіцкай акругі, падкрэслівае аўтар, неабходна весці размову аб адным з наймацнейшых цэнтраў савецкіх партызан на тэрыторыі Беларусі (с. 341).

Удзелена ў манаграфіі ўвага і малавывучанаму пытанню наступстваў партызанскага руху для мясцовага мірнага насельніцтва. Даследчык імкнецца выявіць стратэгіі паводзін мірнага насельніцтва, якія дазвалялі выжыць ва ўмовах знаходжання паміж сіламі савецкага партызанскага руху, падраздзяленнямі Арміі Краёвай і службамі нацысцкага акупацыйнага рэжыму.

У заключнай частцы "Жыццё ва ўмовах панавання двух рэжымаў" (с. 381—387) А.Бракель прадстаўляе высновы свайго даследавання. Мясцовае насельніцтва перажыло Другую сусветную вайну як наступствы панавання двух рэжымаў — спачатку савецкага, а потым нацысцкага. Савецкая палітыка мела рысы "маналітнасці", паколькі мясцовыя ўлады выконвалі ўказанні Мінска і Масквы, тады як нацысцкая палітыка праводзілася living рознымі арганізацыямі (вермахтам, грамадзянскімі ўладамі, службамі СС). Галоўныя адрозненні ў іх палітыцы аўтар бачыць ва ўмовах, у якіх дзейнічалі савецкія і нямецкія органы ўлады. Савецкая ўлада дзейнічала ў мірных абставінах, тады як немцы праводзілі сваю палітыку ва ўмовах працяглай і жорсткай вайны. У 1941—1944 гг. мясцовае насельніцтва фактычна знаходзілася ў "трохкутніку" паміж нямецкай акупацыйнай уладай і дзвюма антаганістычнымі падпольнымі групамі — савецкага партызанскага руху і польскага ўзброенага супраціўлення. Гэта прыводзіла да расколу грамадства. А.Бракель, аднак, аспрэчвае думку вядомага нямецкага гісторыка Б.К'яры аб "суцэльнай атамізацыі ваеннага грамадства" (с. 387).

Такім чынам, А.Бракелю ўдалося ў абсалютнай большасці паспяхова рэалізаваць пастаўленыя задачы і прапанаваць нямецкамоўнаму чытачу даволі поўную карціну штодзённага жыцця насельніцтва Баранавіцкай вобласці і Баранавіцкай акругі ў 1939—1944 гг. Яго несумненнай заслугай з'яўляецца працяг навуковага пачыну Б.К'яры па даследаванні гісторыі "ваеннай штодзённасці" Беларусі. Важнай адметнасцю працы А.Бракеля з'яўляецца выяўленне сутнасці бальшавіцкай і нацысцкай палітыкі, імкненне да рэалістычнага паказу ваеннага мінулага на прыкладзе рэгіянальнай гісторыі Беларусі. У працы абгрунтаваны тэзіс аб важнасці выяўлення спецыфікі існавання беларускага грамадства ва ўмовах панавання розных палітычных рэжымаў. Грунтоўная манаграфія А.Бракеля, несумненна, павінна паслужыць імпульсам для далейшага вывучэння рэгіянальнай гісторыі Беларусі ў гады нацысцкай акупацыі.

На нашу думку, адной з актуальных задач цяпер з'яўляецца пераклад вышэй адзначаных прац на беларускую мову.